УДК 159.9,37
ББК 88.8
П24

Рекомендовано Советом педагогического факультета
ГрГУ им. Я. Купалы.

Редакционная коллегия:
*Сергейко С.А.*, кандидат педагогических наук, доцент (гл. ред.);
*Чепиков В.Т.*, доктор педагогических наук, профессор;
*Тарантей В.П.*, доктор педагогических наук, профессор;
*Ковалевский П.А.*, кандидат психологических наук, доцент;
*Бобровник Л.И.*, кандидат педагогических наук, доцент.

Под научной редакцией доктора педагогических наук,
профессора *В.Т. Чепикова.*

Рецензенты:
*Леонюк Н.А.*, кандидат педагогических наук, доцент
(БрГУ им. А.С. Пушкина);
*Семчук Л.А.*, кандидат психологических наук, доцент.

П24 **Педагогика** и психология детства: современное состояние, перспективы развития : сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол.: С.А. Сергейко (гл. ред.) [и др.] ; под науч. ред. В.Т. Чепикова. – Гродно : ГрГУ, 2011. – 315 с.
ISBN 978-985-515-427-4

Основу сборника составляют научные статьи участников одноименной Республиканской научно-практической конференции (г. Гродно, 20–21 мая 2010 г.), раскрывающие теоретические основы организации обучения и воспитания дошкольников и младших школьников, обеспечение качества подготовки педагогов для дошкольного и начального образования, вопросы психологии детства, ее развития и совершенствования. Адресовано широкому кругу читателей – психологов и педагогов.

**УДК 159.9,37**
**ББК 88.8**

**ISBN 978-985-515-427-4**

© Учреждение образования
«Гродненский государственный университет
имени Янки Купалы», 2011

*Список литературы*

1. Толстых, А.В. Опыт конкретно-исторической психологии личности / А.В. Толстых. – СПб.: Алетейя, 2000. – 288 с.

***Грачева О.О.**, кандидат искусствоведения, доцент кафедры психологии и педагогики БГУ культуры и искусств.*

УДК 373.24

**Д.М. Дубініна**

# ТЭХНАЛОГІЯ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

*Артыкул прысвечаны раскрыццю тэхналогіі этнакультурнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту. Аўтар вызначае сутнасную характарыстыку этнакультурнай адукаванасці, дае структурную пабудову станаўлення этнакультурнай адукаванасці дзяцей дашкольнага ўзросту, раскрывае сродкі тэхналогіі і змест дашкольнай этнакультурнай адукацыі*

Дашкольная этнакультурная адукацыя мае характар педагагічнай сістэмы, стратэгічнай мэтай якой з’яўляецца станаўленне этнакультурнай асобы, якая набывае этнакультурную адукаванасць. Этнакультурная адукацыя разглядаецца навукоўцамі як асобая сфера культуры, якая звязана не толькі з засваеннем дзецьмі дашкольнага ўзросту ўстойлівых культурных нормаў і каштоўнасцей, але і з іх уключэннем ў дзейнасць па творчым пераўтварэнні сацыякультурнага асяроддзя.

На сённяшні дзень дзеці ў Беларусі выхоўваюцца ў блізкароднаснай білінгвальнай прасторы. Наяўнасць сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму сведчыць аб тым, што выхаванне дзіцяці адбываецца ў межах палілогу культур, засваення сусветнай і нацыянальных культур, культуры беларускага народа. Адсюль вызначэнне тактыкі і тэхналогіі фарміравання этнакультурнай адукаванасці дзіцяці набывае асобую актуальнасць.

Разам з тым, вывучэнне практыкі работы сучасных дашкольных устаноў рэспублікі паказвае, што этнакультурная адукацыя дзяцей рэалізуецца ў асноўным як пазнавальны працэс, накіраваны на засваенне дашкольнікамі канкрэтных звестак пра культуру. Пры гэтым амаль не ўлічваецца значнасць засваення выхаванцамі

пэўных культурных мадэляў, іх запатрабаванасць у самастойным вырашэнні дзецьмі жыццёвых сітуацый. Акрэсленая праблема ставіць на першы план неабходнасць распрацоўкі тэхналагічнага накірунку станаўлення этнакультурнай адукаванасці асобы дзіцяці дашкольнага ўзросту.

Сутнасная характарыстыка этнакультурнай адукаванасці выражаецца ў авалодванні (засваенні) асобай этнакультурным вопытам (спадчынай), наяўнасці эмацыянальна-каштоўнасных адносін да дадзенага вопыту, а таксама ў здольнасці асобы карыстацца засвоеным вопытам ў розных сферах сваёй жыццядзейнасці. Этнакультурная адукаванасць дзяцей уключае змястоўны (этнакультурныя веды), асобасны (асобасныя якасці актыўнага суб'екта этнакультурнага адукацыйнага працэсу) і дзейнасны (этнакультурная дзейнасць) кампаненты.

Структурная пабудова станаўлення этнакультурнай адукаванасці дзяцей дашкольнага ўзросту складаецца з канцэптуальнага, нарматыўнага, арганізацыйна-метадычнага, вынікова-дыягнастычнага блокаў. Канцэптуальны блок уключае галоўную ідэю, спектр мэтавых арыентацый, канцэптуальныя палажэнні. Нарматыўны блок раскрывае змест асноўных нарматыўных і прававых дакументаў, якія вызначаюць магчымасць укаранення тэхналогіі ў адукацыйны працэс. Арганізацыйна-метадычны блок вызначае педагагічныя прынцыпы, сродкі і асаблівасці зместу тэхналогіі, спосабы ўзаемадзеяння з дзіцём. Вынікова-дыягнастычны блок прадстаўлены дыягнастычнымі методыкамі і крытэрыямі ацэнкі эфектыўнасці тэхналогіі.

Спецыфіка этнакультурнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту заключаецца ў тым, што гэты працэс рэалізуецца ў логіцы педагагічнай падтрымкі дзіцяці ў яго нацыянальна-культурным, духоўна-маральным самавызначэнні.

Мэтаю этнакультурнай адукацыі з'яўляецца распрацоўка найбольш аптымальных шляхоў станаўлення этнакультурнай адукаванасці асобы суб'ектаў адукацыйнага працэсу дашкольнай установы; фарміравання нацыянальна-культурнага аблічча асобы дашкольніка на аснове прыняцця ім каштоўнаснага ідэалу роднай культуры. Каштоўнасныя арыенціры складаюць падмурак фарміравання маральна-сэнсавай дамінанты карціны свету, а затым праяўлення гэтай карціны ў жыццядзейнасці як аднаго дзіцяці, так і сукупнасці дзяцей і дарослых. Пры гэтым маральнае самавызначэнне дзіцяці, якое расце ў гістарычна зменлівай сацыякультурнай рэчаі-

снасці, ажыццяўляецца шляхам уласнага асобасна-значнага выбару пэўных каштоўнасных арыенціраў і спосабаў узаемадзеяння з сацыякультурным акружэннем.

Дыдактычныя арыенціры вызначаюць фарміраванне базісных кампанентаў асобы, якія забяспечваюць станоўчае ўключэнне дзіцяці ў культуратворчую дзейнасць. Выхаваўчыя арыенціры акрэсліваюць станаўленне ў дзіцяці сумленнаснай дамінанты карціны свету і вобраза жыцця. Развіццёвыя арыенціры вызначаюць развіццё культуратворчых здольнасцей. Сацыялізуючыя арыенціры абумоўліваюць авалодванне роднай мовай; захаванне нацыянальнай самабытнасці; рэалізацыю нацыянальна-культурных правоў маленькіх грамадзян Беларусі.

Канцэптуальнай асновай выбару мэты і зместу этнакультурнай адукацыі выступае ідэя выхавання дзіцяці як асобы, якая ўключана ў айчынную культурную традыцыю (С.І. Гесен, І.А. Ільін, К.Д. Ушынскі і інш.). Канкрэтызацыя гэтай ідэі ажыццяўляецца на аснове тэхналогіі дашкольнай этнакультурнай адукацыі, якая прадстаўляе сабой этнакультурную накіраванасць цэласнага адукацыйнага працэса на станаўленне этнакультурнай адукаванасці асобы дзяцей.

Станаўленне этнакультурнай адукаванасці дзяцей дашкольнага ўзросту ажыццяўляецца ў адпаведнасці з агульнапедагагічнымі і спецыфічнымі прынцыпамі. Сярод агульнапедагагічных прынцыпаў неабходна вызначыць такія, як прынцып навуковасці, прынцып цэласнасці і сістэмнасці, прынцып інтэграцыі, прынцып гуманістычнай і дзейнаснай арыентацыі адукацыі, прынцып асобаснага падыходу ў выхаванні, прынцып суб'ектнасці ў выхаванні. Да спецыфічных прынцыпаў адносяцца: прынцып культураадпаведнасці адукацыйнага працэсу дашкольнай установы, прынцып выхоўваючага культурнага асяроддзя, дыялогу культур, гуманітарнага этнакультурнага мыслення, згодна якому пазнанне і засваенне этнакультуры ажыццяўляецца на аснове сістэмы ўяўленняў і паняццяў пра ролю і месца чалавека ў культуры; гуманітарнага краязнаўства.

Вызначальнымі сродкамі тэхналогіі этнакультурнай адукацыі выступаюць кампаненты народнай культуры, у якіх праяўляюцца дух і традыцыі народа, яго абрады і звычаі. Спецыфічнымі сродкамі этнакультурнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту выступаюць: родная прырода; вусна-паэтычная творчасць; элементарная этнічная гісторыя; прадметы побыту; народны строй; народнае мастацтва; народны каляндар.

Змест дашкольнай этнакультурнай адукацыі адлюстроўвае сукупнасць кампанентаў этнічнай культуры, якія даступны ўспрыманню дзяцей дашкольнага ўзросту, і рэалізуе адукацыйную праграму, пабудаваную на ідэях народнай педагогікі беларусаў. Змест уключае перадачу этналагічных ведаў, на аснове якіх складваюцца ўяўленні, і з узнікненнем пэўнага матыва трансфармацыю гэтых ведаў у адносіны, якія ў сваю чаргу фарміруюць пачуццё прывязанасці да роднага кутка, пачуццё любві да роднага краю, да любай Радзімы, пачуццё патрыятызму.

Авалодванне дзецьмі дашкольнага ўзросту на аснове сапраўды этналагічных ведаў устойлівымі культурнымі нормамі, усведамленне пэўных каштоўнасцей фарміруе асэнсаваны характар адносін, дае пачатак этналагічнай свядомасці і спрыяе ўключэнню дашкольнікаў у дзейнасць па творчым пераўтварэнні сацыякультурнага асяроддзя.

Рэалізацыя зместу этнакультурнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту адбываецца ў адпаведнасці з трыма структурнымі накірункамі: народазнаўства, краязнаўства, народнага мастацтва.

Першы накірунак уключае авалодванне дзецьмі родным маўленнем, засваенне імі звестак пра народны каляндар; быт беларусаў і пэўны лад іх жыцця; прытрымліванне народных звычаяў, абрадаў, традыцый, народнага этыкету; актыўны ўдзел дашкольнікаў у культуратворчай дзейнасці.

Зместам другога накірунка выступае атрыманне дзецьмі дашкольнага ўзросту пэўных звестак і ўяўленняў аб прыродзе Беларусі; памятніках культуры і архітэктуры; іх актыўны ўдзел у культураахоўваючай і культуратворчай дзейнасці.

Трэці накірунак абумоўлівае садзейніцтва станаўленню ў дзяцей дашкольнага ўзросту пэўных адносін да народнага мастацтва беларусаў, народнай музыкі, народнага тэатру, вусна-паэтычнай народнай творчасці, іх уласную мастацкатворчую дзейнасць.

Арганізацыя работы адносна ўсіх накірункаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з логікай сацыяльнага «акультурвання» дзіцяці (С.А. Казлова), якая працякае як актыўны жыццёвадзейнасны працэс пазнання навакольнай сацыяльнай рэчаіснасці.

Методыка работы вызначае сабой актыўнае дачыненне дзяцей да культурнай спадчыны беларускага народа, станаўленне ў іх пэўных асобасных якасцей. Гэтае дачыненне ажыццяўляецца праз разнастайныя формы работы з дзецьмі, якія маюць шматфункцыянальны характар і вызначаюцца актыўнымі ўзаемінамі дарослых і дзяцей. Асноўнымі формамі рэалізацыі народных традыцый у аду-

кацыйнай прасторы дашкольнай установы выступаюць камунікатыўна-адукацыйныя сітуацыі, якія плануюцца і арганізоўваюцца педагогам у любы час на працягу дня. Адукацыйны працэс інтэгруецца з гульнявой, пазнавальнай, мастацка-выяўленчай, музычнай, мастацка-маўленчай дзейнасцю і працэсам змястоўных зносін паміж дзецьмі, паміж дзецьмі і педагогам на аснове адзінага этнакультурнага зместу.

Планаванне адукацыйных сітуацый ажыццяўляецца з апорай на ўмовы развіваючай адукацыйнай прасторы: пазнавальна-актывізуючыя зносіны з дзецьмі; мэтавыя прагулкі (экскурсіі) у мастацкую майстэрню, краязнаўчы музей, этнакультурны цэнтр; самастойная дзейнасць дзяцей, прадстаўленая гульнявой, пазнавальнай, мастацка-маўленчай, выяўленчай і іншымі прадуктыўнымі дзейнасцямі; культурна-адпачынкавая дзейнасць дзяцей, якая ўключае святы, прысвяткі, гульні-забавы, гульні-карагоды, тэатралізаваныя гульні.

Правядзенне інтэграваных і камбінаваных камунікатыўна-адукацыйных сітуацый уключае спектр метадаў і прыёмаў этнакультурнай адукацыі дашкольнікаў: метады, накіраваныя на фарміраванне этнакультурнай свядомасці (размовы, гутаркі, разглядванне прадметаў побыту, народнага строю, посуду, вырабаў народных рамёстваў; разглядванне карты Беларусі «Вандроўкі па роднаму краю; метад этнічнай тапанімії, г. зн. знаёмства з назвамі беларускіх гарадоў, мястэчак і вёсак; эўрыстычныя размовы «Традыцыі нашай сям'і», «Нашы абрады» і інш.); метады, спрыяючыя развіццю эмацыянальна-каштоўнасных адносін: гульнявыя метады (сенсорна-эмацыянальныя гульні «Адгадай, чый народны касцюм», «Любімыя колеры на тканых вырабах беларускіх майстроў», «Адгадай, якая гэта нацыянальная страва», «Каму што трэба для работы» і інш.); метады дзейнасна-практычнага стымулявання: картаграфічны метад («Вандроўкі па карце», «Вандроўкі ў гісторыю края, жыццё народа» і інш.); метад мадэліравання («Народныя промыслы і рамёствы», «Народны строй беларусаў», «Лясы Беларусі», «Прыродныя зоны Беларусі» і інш.).

Вялікае значэнне для павышэння этнакультурнай адукаванасці дзяцей маюць прыёмы, якія выступаюць часткай таго ці іншага метада. У першай групе метадаў асноўнымі прыёмамі выступаюць: тлумачэнне, напамінанне, параўнанне, праблемныя пытанні, загадкі, разважанні, доказы. Да другой групы метадаў этнакультурнай адукацыі дашкольнікаў мы аднеслі такія прыёмы, як: сюрп-

рызныя моманты; увядзенне народных і казачных персанажаў; выкананне гульнявых дзеянняў; разыгрыванне роляў, эцюдаў, стварэнне сітуацый поспеху; пастаноўка дзяцей у пазіцыю ўяўляемага героя. Трэцяя група метадаў вызначаеццца такімі прыемамі, як творчыя заданні, састаўленне калажа, «радавога дрэва»; калекцыянаванне атрыбутаў народнага быта.

У працесе камунікатыўных сітуацый наладжваюцца адукацыйныя адносіны, якія ўяўляюць сабой характар суб'ектна-суб'ектных, асобасна-арыентаваных узаемадзеянняў удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Для дзяцей сукупнасць адукацыйных адносін уяўляе сабой дзіцяча-дарослую сукупнасць, якая характарызуецца агульнасцю існавання дарослых і дзетак на аснове ўзаемнага пазнання, разумення і прымання адным другога, сатворчасці, суперажывання, дзе ўлічваюцца інтарэсы і здольнаці кожнага, яго дасягненні і поспехі.

Дыягнастычны блок тэхналогіі ўключае педагагічную дыягностыку культурнага вопыту дзіцяці дашкольнага ўзросту. Мэта дыягностыкі: вызначыць асаблівасці адносін дзяцей сярэдняга і старэйшага дашкольнага ўзросту да культуры беларускага народа. Задачы дыягностыкі: выявіць цікавасць дзяцей да гісторыі Беларусі; да асноўных кампанентаў яе духоўнай і матэрыяльнай культуры; вызначыць адметнасць уяўленняў дзяцей пра прадметы побыту, народны строй, народныя гульні і цацкі, вусна-паэтычную творчасць; вызначыць спецыфіку ўяўленняў дзяцей пра народныя святы, звычаі і абрады; выявіць жаданне дзяцей адлюстроўваць атрыманыя ўяўленні ў розных відах дзейнасці: гульнявой, выяўленчай, тэатралізаванай. Для рэалізацыі пастаўленай мэты і задач выкарыстоўваюцца такія метады, як назіранне, эксперыментальныя сітуацыі, гутаркі.

### *Спіс літаратуры*

1. Бабунова, Е.С. Познавательная игротека как форма приобщения дошкольников к народной традиционной культуре / Е.С. Бабунова // Начальная школа плюс До и После. – 2009. – № 5. – С. 34–39.

2. Бабунова, Е.С. Методика становлеиия этнокультурной образованности детей предшкольного возраста / Е.С. Бабунова // Начальная школа плюс До и После. – 2009. – № 6. – С. 21–25.

3. Бороздина, О.С. Из опыта работы по приобщению детей к традиционной народной культуре / О.С. Бороздина // Начальная школа. – 1994. – № 10. – С. 17–19.

4. Бороздина, О.С. Школа народной культуры / О.С. Бороздиıа // Искусство в школе. – 1995. – № 4. – С. 18–22.

5. Дубініна, Д.М. Культура Беларусі ў казках і нааннях / Д.М. Дубініна, Дз.У. Дубінін. – Мінск: Зорны верасень, 2008. – С. 27–31.

*Дубініна Д.М., кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры методык дашкольнай адукацыі БДПУ ім. М. Танка.*

УДК 373.24

**З.Р. Железнякова**

# ОСОБЕННОСТИ РУКОВОДСТВА ИГРАМИ ДЕТЕЙ РАННЕГО ВОЗРАСТА

*На основе анализа практической деятельности педагогов дошкольных учреждений показано, что воспитатели испытывают особую трудность в организации совместной игры с детьми раннего возраста. Предложенные автором методы и приемы руководства играми оказались результативными, если для этого воспитатель сначала наблюдал и анализировал самостоятельную игру каждого ребенка, а затем на основе этого планировал задачи развития игры и способы руководства ею, что позволило успешнее использовать специфические развивающие функции игры, сохранить игру как форму детской самодеятельности.*

Практически все исследователи детской игры отмечают, что участие в игре взрослого – важнейшее условие становления и развития игры. Именно та игра, в которой в качестве партнера выступает взрослый человек, вызывает у детей наибольший интерес. Наши наблюдения за практической деятельностью педагогов дошкольных учреждений показывают, что воспитатели испытывают особую трудность в организации совместной игры с детьми. Изучая содержание воздействий воспитателей и их влияние на поведение детей в самостоятельной деятельности, мы установили, что воспитатели преимущественно используют следующие приемы руководства играми детей: указания, замечания, запреты, вопросы, подсказки. Много внимания уделяют внешнему порядку и дисциплине в группе. Действия детей ограничены, однообразны, в большинстве случаев не целенаправленны. Собственная активность, инициатива детей подавляется. Очень часто дети бездействуют, ожидая указаний взрослого. Приведем типичный пример.

Дети сидят на ковре, воспитатель за столом. Воспитатель: «Дети, можете взять машинки, играть в больницу (сама пишет)». Артем Ш., Женя Ч., Дима Д. берут строительный материал. Артем Ш. подвозит материал на машине, Женя Ч. сооружает постройку.